# ГУТАРКА АБ СПРАВЕ ЧЫНЫМ

Мне, радыёжурналісту, даволі нязвыкла пераносіць гутарку на паперу. Лічу, што напісанае інтэрв'ю пры апрацоўцы не такое свабоднае, яно становіцца больш «прыгладжаным». І зусім іншая справа, калі такое інтэрв'ю гучыць у радыёэфіры – гэта імправізацыя, чалавек перад табой адкрыты і, скажу па сакрэце, вельмі безабаронны. Ты можаш сачыць за ходам яго думкі, правакаваць яго пэўныя эмоцыі, якія, вядома ж, адчуе слухач. Ды і тэхнічна радыёінтэрв'ю дае большыя магчымасці. Мяркуйце самі: тэкст, напісаны на адным лісце паперы фарматам А4, дыктар чытае прыкладна 2 хвіліны. Такім чынам за 30 хвілін гутаркі атрымліваецца 15 старонак. Такі аб'ём цяжка змясціць у друку. А калі ты гутарыш больш за гадзіну, як напрыклад, гэта было ў нас з былым рэктарам Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў Ядвігай Дамінікаўнай Грыгаровіч? І што самае важнае – са сваім суразмоўцам табе так цікава, што ты не звяртаеш увагі ні на час, ні на якія іншыя абставіны. Чаго не можа сабе дазволіць тэлебачанне…

Радыё ж, калі хочаце, у пэўнай меры – інтым. Гэта сродак, які дазваляе чалавеку раскрыцца найбольш. Пры дапамозе мікрафона можна глыбока пранікнуць у сэрца і душу чалавека – паверце мне.

Вось я і вырашыў падсумаваць свой вопыт назіранняў, стаўленняў, гутарак (не люблю слова «інтэрв'ю» – яно нейкае афіцыйна-інфармацыйнае, а «гутарка-размова» – камунікатыўнае і культуралагічнае) з жанчынай-рэктарам Ядвігай Дамінікаўнай Грыгаровіч. А таксама мне пашчасціла адшукаць вельмі цікавую радыёкрыніцу – перадачу пра яе, падрыхтаваную Валянцінай Стэльмах у серыі «Галерэя», якую вядомая журналістка Першага нацыянальнага канала Беларускага радыё стварае на працягу некалькіх гадоў. Гэта своеасаблівая галерэя партрэтаў славутых беларускіх асоб, якія ў прамым сэнсе ствараюць сучасную Беларусь і ўжо ўвайшлі ў яе гісторыю. Тут матэрыялы гэтай перадачы і мае асабістыя. Гутарылі з Ядвігай Дамінікаўнай мы на тэмы розныя – афіцыйныя і асабістага плану. Пра афіцыйнае яна гаворыць вельмі канкрэтна і шчыра. Пра асабістае – таксама.

– Што такое сёння Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў? – разважае Ядвіга Грыгаровіч, – гэта шматпрофільная навучальна-вучэбна-творчая ўстанова з аўтаномнай сістэмай культуралагічнай і мастацкай адукацыі. Гэта культурны цэнтр нашай краіны, які аб'ядноўвае ўсе віды мастацкай творчасці і сацыякультурнай дзейнасці. Студэнты нашай alma-mater не толькі вывучаюць беларускае мастацтва і каштоўнасці, здабыткі, традыцыі, звычаі, але і даследуюць іх, занатоўваюць і перадаюць, транслююць народу. Такі ланцужок добра можна ўявіць, вывучыўшы назвы нашых факультэтаў. Напрыклад, калі факультэт культуралогіі і сацыякультурнай дзейнасці больш тэарэтычнага накірунку, на якім вывучаецца творчая дзейнасць нашага народа, а факультэт традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва займаецца даследаваннем і выкарыстаннем асаблівасцей традыцыйнай культурнай і мастацкай дзейнасці беларусаў, то факультэты музычнага мастацтва, інфармацыйна-дакументных камунікацый, павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў з'яўляюцца суб'ектамі, што транслююць культуру, назапашаныя беларусамі духоўныя каштоўнасці.

Што такое ансамбль «Талака»? Адметны калектыў, які, даследаваўшы, спазнаўшы народныя песні і танцы, вяртае іх нашаму народу праз свае выступленні. Што такое кафедра народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва? У яе ўваходзяць студэнты і выкладчыкі, якія, дасканала вывучыўшы народныя рамёствы, ствараюць, адраджаюць і зноў жа вяртаюць нам тое, што, здаецца, ужо даўно забыта. Ці бачылі вы, каб у каго на акне сёння вісела выцінанка ці маляваны дыван на сцяне? Мала каму пашчасціла нават пазнаёміцца з гэтымі сапраўднымі шэдэўрамі народнага мастацтва. А выбеленыя ручнікі альбо ручное ткацтва… Усё гэта вы можаце ўбачыць у майстэрнях нашых студэнтаў, яны іх узнавілі і адрадзілі. І самае адметнае: атрыманыя веды, уменні і навыкі нашы студэнты развозяць па ўсіх куточках краіны… Цэнтры рамёстваў, гурткі і аб'яднанні ствараюцца дзякуючы намаганням і нашых студэнтаў. Што такое сёння лабараторыя харэаграфічнага мастацтва? Калісьці легендарная асоба, даследчыца беларускай традыцыйнай культуры, прафесар, доктар мастацтвазнаўства Юлія Міхайлаўна Чурко занатавала беларускія танцы (гэта было 30 – 40 гадоў таму), а цяпер яны адраджаюцца і транслююцца нашымі студэнтамі. Мне падаецца, што гэтая функцыя нашага універсітэта спецыфі-

# Гутарка аб сапраўдным

чная і незвычайная. Напэўна, няма ў Беларусі навучальных устаноў, якія вядуць такую шырокую не толькі адукацыйную і навукова-даследчую, але і культурніцкую дзейнасць.



– Усяго некалькі слоў: у чым прыярытэт універсітэта культуры і мастацтваў сярод іншых навучальных устаноў сталіцы?

– Прыярытэт нашага універсітэта сярод іншых навучальных устаноў краіны Беларусь у тым, што ён даследуе і транслірue нацыянальную культуру, і гэта, прабачце за таўталогію, наш галоўны прыярытэт. Што ёсць культура? Сукупнасць усіх матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей, назапашаных нашым народам за ўвесь час свайго існавання, і менавіта гэтая сукупнасць ёсць прадмет нашага навучання. Таму мы імкнемся працаваць на беларускай мове. Кожны адукаваны чалавек разумее, што вывучаць нацыянальную культуру трэба на нацыянальнай мове – кодавым знаку культуры. Нельга здраджваць сваей мацеры, недапушчальная і здрада сваёй роднай краіне, яе культуры, гісторыі. Недапушчальна забыць мову, на якой размаўлялі вашы маці і бацька, бабулі і дзядулі, прабабулі і прадзядулі і многа пра-пра-пра-пра…

– Давайце паспрабуем з вамі намаляваць вобразны партрэт сярэднестатыстычнага студэнта універсітэта культуры і мастацтваў.

– Часам на рэктаратах, на саветах універсітэта, калі разглядаем сур'ёзныя пытанні студэнцкага жыцця, я кажу адну і тую ж фразу: «Шаноўныя выкладчыкі, наша бяда – працяг нашага шчасця. Наша шчасце ў тым, што ў нас цудоўныя студэнты, а наша бяда, што мы адразу ўлюбляемся ў іх, роднімся з імі, шкадуем іх і вядзем за ручку ўсе пяць гадоў. Гэта не дазваляе нам аб'ектыўна ацаніць іх вучэбныя, навуковыя і творчыя дасягненні».

Я бываю ў іншых навучальных установах (маё меркаванне, вядома ж, таксама не можа быць аб'ектыўным, таму што я, як і ўсе выкладчыкі, улюбёная ў сваіх студэнтаў) і магу заўважыць: нашыя студэнты такія ж разумныя, як і студэнты іншых ВНУ, такія ж дасціпныя і дапытлівыя, такія ж працавітыя. Але… нашы студэнты ўмеюць працаваць сістэмна, бо да паступлення прайшлі вялікую школу жыцця ў культуралагічнай і мастацкай сферы. Наш студэнт – творчы. Яшчэ – вольны і свабодны. У яго свабодны творчы дух, своеасаблівая свабода паводзін, якая вызначана абароненасцю. Дастаткова сказаць: у нас самая нізкая адлічаемасць студэнтаў у горадзе Мінску. Кожны раз (не паверыце!), калі да мяне паступаюць дакументы з дэканата на адлічэнне, я вельмі адказна, нанова дасканала вывучаю асабістую справу, усе «за» і «супраць», прашу пераглядзіць і разабрацца, ці сапраўды студэнт не можа навучацца і павінен пакінуць універсітэт.

Ну і ў нас, канешне, самыя прыгожыя студэнты. Бачна вонкава! Візуальна!

– Кажуць, Ваш прадзед Язэп выдатна граў на розных інструментах?

– Сапраўды, мне мама расказвала (гэта ўжо не мой прадзед, а пра-прадзед) пра свайго дзеда Язэпа, які памёр з дудкай у руках. У нашым родзе і пазней час ад часу нараджаліся музыканты і вельмі нядрэнныя. На-

# ГУТАРКА АБ СПРАДВЕЧНЫМ

## Гісторыя аднаго фотаздымка



Гэты фотаздымак мы атрымалі ад Ядвігі Дамінікаўны Грыгаровіч яшчэ ўлетку. На ім быў надпіс: "Няхай студэнты пасмяюцца"

прыклад, мая пляменніца. Расце цудоўная дзяўчынка Каралінка, якая грае на фартэп'яна, дарэчы, з вялікім задавальненнем і радасцю. Мы нарадзіліся і выраслі ў вельмі ціхай вёсачцы са звыклым хорам птушак. Помню, напрыклад, што салавей жыў у нас на вішні, літаральна пад акном, дзе я спала. Мама казала тату: «Дамінік, ідзі паганяй салаўя, а то ён нам дзіця пабудзіць». Дзіця – гэта была я, хаця мне было тады за 30 (смяецца).

Былі ў мяне пэўныя здольнасці да музыкі, таму напачатку паступіла ў Бабруйскую музычную школу па класе домры, потым – на літаратурна-музычны факультэт тады яшчэ Мінскага педагагічнага інстытута. Дыпломная работа была пра выкарыстанне музыкі пры выкладанні літаратуры. Потым – аспірантура ў Інстытуце мастацкага выхавання ў Маскве. У 28 гадоў абараніла кандыдацкую дысертацыю. Некаторы час працавала выкладчыцай рускай літаратуры, музыкі і спеваў у некалькіх школах сталіцы, даследавала эстэтычнае выхаванне школьнікаў у Навукова-даследчым інстытуце педагогікі. Потым – універсітэт (тады яшчэ Мінскі інстытут культуры). Загадвала кафедрай педагогікі сацыякультурнай дзейнасці. Потым прызначылі прарэктарам. Ну і ў 1992 годзе абрана рэктарам. Як бачыце, жыццё звязана з культурай і мастацтвам.

Я ўжо даўно заўважыла, што людзі, якія выраслі паблізу вялікай ракі, адрозніваюцца пэўным тэмпераментам, норавам гэтай ракі. Яны паводзяць сябе смела і эмацыянальна, як і тая рака. Каля ракі я ўжо не жыву каля 40 гадоў, калі пераехала ў Мінск з вёскі Даманова, што на Беразіне, але і цяпер вымяраю свой час плынню гэтай ракі. І, напэўна, таму ў садзіку каля майго загараднага доміка расце не бульба. Там растуць сосны, елкі, вярба, кветкі, якія калісьці раслі ў маёй вёсцы, вы ведаеце іх – гэта жоўтыя шары вяргінь, блакітны аканіт, касачы, нагаткі і г.д. Ёсць нейкае такое імкненне захаваць той вясковы мікраклімат, які быў для мяне самым шчаслівым і самым, напэўна, найлепшым.

Я вельмі люблю прыязджаць на вёску. Для сваіх аднавяскоўцаў я заўсёды была Яніна, Ядзя альбо Дамінікава Ядзя. Там я атрымліваю заспакаенне і адпачываю, там мой родны дом, там мая рака, якую я ведаю і адчуваю, калі яна гневаецца, калі яна сур'ёзная, а калі радасная. Я вельмі люблю рэчку, сяду вечарам на высокім беразе і гляджу на яе, раздумваю і проста супакойваюся, суцяшаюся ад гэтага бесперапыннага руху, які называецца жыццём.

– На Ваш погляд, якімі ўзорамі мастацтва павінен узбагаціцца кожны чалавек? Іншымі словамі: што для вас духоўныя каштоўнасці?

– Мастацтва – гэта вельмі важны сродак і частка культуры. Важнае эмацыянальнае асэнсаванне свету. Але паняцце «культура» значна шырэй-

# ГУТАРКА АБ СПРАДВЕЧНЫМ

шае, бо ўключае ў сябе і інтэлектуальную сферу чалавека, і камунікатыўныя яго магчымасці, і яго ўменне суперажываць іншаму. Культура – гэта ўсё тое, што мы стварылі, і тое, што характэрна пэўнаму чалавеку. З аднаго боку – гэта матэрыяльныя набыткі, а з другога боку – чалавечыя каштоўнасці, якія суправаджаюць нас па жыцці і, што самае галоўнае, якія робяць нас, мяне, вас – чалавекам. Я чалавека вымяраю па шэрагу параметраў, і адзін з першых – узровень яго культурнага развіцця. Культура – гэта яшчэ і сістэма традыцый. Мне падаецца, што ў вызначэнні культуры як характарыстыкі пэўнага чалавека можа быць асноўны змест вельмі просты: жыць трэба так, каб не перашкаджаць іншым і заставацца Чалавекам.

Вельмі важна засвоіць той мінімум культуры свайго народа, сваёй нацыянальнасці, які вызначае прыналежнасць асобы да грамадства – тое, што называюць нацыянальнай самаідэнтыфікацыяй. Гэта вельмі важна, і мая задача: культуру панесці далей, перадаць сваім дзецям, у маім шчаслівым выпадку – яшчэ і вучням. Я чалавек не зацыклены, але вельмі цяжка ўяўляю, як можа беларус не ведаць Купалу, не чытаць яго вершаў, не ведаць свае нацыянальныя традыцыі і сваё нацыянальнае мастацтва. З іншага боку, як мне падаецца, не спазнаўшы Шэкспіра, Пушкіна, Гётэ цяжка лічыць сябе паўнавартасным чалавекам і адчуваць сябе жыхаром Еўропы. Я не магу ўявіць сваё уласнае жыццё без музыкі Вагнера і Шапэна, якая мне разумова і духоўна блізкая. Можна, вядома, пражыць, не чытаючы літаратурных геніяў, не слухаючы сапраўдную музыку, але лічыць сябе пры гэтым культурным чалавекам наўрад ці мажліва.

– Якія якасці ў людзях Вы цэніце найбольш?

– Самае першае – прыстойнасць, чысціня помыслаў і разумнасць учынкаў... А яшчэ цаню ў людзях эмпатыю – уменне зразумець і спачуваць іншаму чалавеку, дзіцяці, жывёліне, расліне, любіць і абараняць, а таксама ствараць прыгажосць вакол сябе і іншых.

– Ці ёсць нешта ў жыцці, аб чым вы шкадуеце, і калі б была такая магчымасць, што б вы хацелі перарабіць-перайграць?

– Не вельмі студэнцкае пытанне. Напэўна, няма ў мяне такога... але... шкадую, што ў мяне толькі адзін сын. Я бязмерна яго люблю, шчыра ганаруся ім і ўдзячная, што ён нарадзіўся. Але трэба было б яшчэ дачушку...

– Вы верыце ў Бога?

– Калісьці мы задалі такое пытанне аднаму замежнаму госцю, што быў у нашым універсітэце. Ён зрабіў вельмі сур'ёзны выгляд і сказаў: на інтымныя пытанні я не адказваю. Сапраўды, гэта вельмі інтымнае пытанне, але я на яго адкажу: так, я веру ў Бога, веру ў Чалавека і веру ў Справядлівасць светаўладкавання.

– Яшчэ адно інтымнае пытанне: Вы праваслаўная ці каталічка?

– Каталічка.

– Кожны чалавек, патрапіўшы ў складаную сітуацыю, мае пры сабе нейкія магічныя словы, якія ён упэўнена прамаўляе. Вельмі хочацца пачуць вашыя тры словы.

– Не ведаю я такіх слоў. Калі ў мяне складанасці, а яны бываюць сапраўды складанымі, я проста стараюся ўсміхнуцца – і ўсё праходзіць. Праўда, Саламон сцвярджаў, што нішто не праходзіць бясследна. І гэта вопыт...

– Можа, Вы нарадзіліся пад нейкім асаблівым знакам, і гэта адбіваецца на Вашым характары?

– Я не веру ў гараскопы і не надаю гэтаму ніякага значэння, але тое, што я нарадзілася пад знакам Дзевы, і ёсць мая сутнасць. Я чалавек, які ўвесь час рэфлексуе ды аналізуе сябе, свае ўчынкі. Так мала часу і так мала зроблена. А вельмі хочацца яшчэ зрабіць. Усяго не паспяваеш і надзвычай шкада часу, які адыходзіць. У прынцыпе, не ведаю, як іншыя людзі, але мне хочацца час ад часу паленавацца, але не хапае на гэта часу.

Ведаеце, пра што я мару? Прыйсці вечарам дамоў, легчы на канапу і паглядзець тэлевізар. Проста легчы і глядзець, і ні аб чым не думаць. Адпачываю, калі працую ў маім выдатным садзіку, у цяплічцы, дзе пахне памідорамі, як пахла пры маме. Агуркі растуць гэтак жа высока, як некалі ў мамы, і кветачкі таксама. І ўсё робіцца па гэтаму адвечнаму мамінаму цыклу. І важны не так вынік працы, як сам працэс. Дарэчы, і цяпер, калі трэба прыняць рашэнне, то думаю: а што б сказала мама? І дакладна ведаю, што сказала б мама: «Дочачка, што ты робіш! Дочачка, так нельга!» Ці наадварот. І калі ў мяне нешта атрымліваецца, усміхаюся: «Мама б сказала: Маладзец, дачушка!» Гэта самае галоўнае ў нашым жыцці – бацькі і дзеці...

А таксама студэнты – культурныя, творчыя, натхнёныя.

**Зміцер КАРМАЗІН**